УДК 940.2(04)

*Наталля Кавалева, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры сацыяльна-палітычных і гістарычных навук Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта; г. Брэст, РБ.*

## ЭПОХА, ЯКАЯ НАРАДЖАЛА ТЫТАНАЎ

2008 год для беларусаў з'яўляецца багатым на падзеі, звязаныя з ушанавннем знакамітых асоб нашае гісторыі , якія ў пераломны для Беларусі час рупліва і аддана працавалі дзеля Радзімы і ўмелі ўзняцца над абмежаваннямі сваёй эпохі не толькі на словах, але і ў справах. Дзякуючы іх намаганням паўстала ў рэшце-рэшт беларуская нацыянальная ідэя, сфармуляваная К. Каліноўскім, як ідэя стварэння ўласнай беларускай дзяржаўнасці ў форме літоўска-беларускай рэспублікі.

2 лютага споўнілася 170 гадоў з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага (1838-1864), правадыра нацыянальнавызваленчага паўстання 1863-1864 гадоў, радактара і выдаўцы першай беларускай газеты «Мужыцкая праўда».

Вытокі гэтай ідэі трэба шукаць у дзейнасці шматлікіх папярэднікаў К. Каліноўскага, дзякуючы якім беларускае грамадства знайшло досыць сілы, каб падняцца з заняпаду. Час з канца XVIII і да першай паловы XIX стагоддзя быў перыядам выспявання нацыянальнай ідэі, зародак якой можна бачыць у творчасці Ю. Нямцэвіча і яго сучаснікаў, якім наканавана было жыць у пераломную эпоху нашае гісторыі.

Вядома, што грамадства Рэчы Паспалітай было падзелена па прыкмеце веравызнання. Гэты падзел уносіў дадатковы элемент дэстабілізацыі ў палітычнае становішча краіны і даваў суседнім краінам магчымасць выкарыстаць канфлікты на рэлігійнай глебе ў сваіх мэтах. Для Расійскай імперыі рэлігійнае пытанне было толькі зручнай падставай для ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай у сваіх інтарэсах. М. Панін (вядомы расійскі дыпламат) так ахарактэрызаваў мэты знешняй палітыкі Расіі: «Справа дысідэнтаў ніяк не можа быць падставай для пашырэн-

ня ў Рэчы Паспалітай нашай веры і пратэстанцкіх вераванняў, а толькі выключна рычагом заваявання для сябе, з дапамогаю нашых адзінаверцаў і пратэстантаў, моцнай і прыязнай партыі з правам удзелу ў польскіх справах». [1, 214] Падтрымка праваслаўнага насельніцтва ў Рэчы Паспалітай, на думку Кацярыны II, павінна была стварыць у гэтым рэгіёне Еўропы ўмовы для экспансіі Расійскай імперыі на Балканах, у войнах з Турцыяй.

Кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Панятоўскі (Аўгуст IV) разумеў неабходнасць вырашэння дысідэнцкага пытання, але асцерагаўся агульнага адпору папскай курыі, разам з іерархіяй каталіцкай царквы і адмоўнай рэакцыі кансерватыўнага шляхецтва. Аўгуст IV не здолеў выратаваць краіну, але рабіў пэўныя намаганні ў гэтым накірунку: рэалізаваў «памяркоўныя рэформы», правёў значныя пераўтварэнні ў эканамічнай сферы.

12 лютага споўнілася 210 гадоў з дня смерці Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1732-1798), апошняга караля Рэчы Паспалітай, ураджэнца мястэчка Воўчын, Брэсцкага павету (цяпер Камянецкі раён Брэсцкай вобласці).

Кароль Станіслаў Панятоўскі не быў рэлігійным фанатыкам, выказваўся за ўраўноўванне ў правах католікаў і некатолікаў-хрысціян. Але практычнае вырашэнне гэтага пытання на сейме яму бачылася толькі з папярэдняй адменай «ліберум вета». У той час, калі буйная магнатэрыя і суседнія краіны (праваслаўная Расія і пратэстанцкія Прусія, Англія, Данія і Швецыя) спекулявалі на рэлігійным пытанні (жорстка адмоўная пазіцыя Чартарыскіх у дысідэнцкім пытанні прывяла да пагаршэння адносін з пецярбургскім дваром), найбольш дальнабачныя палітыкі адназначна выступалі за вырашэнне гэтай праблемы сваімі ўласнымі сіламі, без уздзеяння знешніх фактараў. Такая пазіцыя была глыбока патрыятычнай, накіраванай на выратаванне краіны ад агрэсіі суседніх дзяржаў.

У гэтых умовах толькі людзі найбольш адукаваныя і самаахвярныя змаглі пераадолець усе забабоны, звязаныя з рэлігійным пытаннем, паглядзець на праблему шырока, у кантэксце ідэй, народжаных Французскай буржуазнай рэвалюцыяй і замацаваных у Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна. Дэкларацыя абвяшчала прынцып нацыянальнага вяршэнства – нацыя обвяшча-

лася адзінай крыніцаю ўсялякай улады. Вядома, што першы артыкул Дэкларацыі абвяшчаў, што людзі нараджаюцца і застаюцца свабоднымі і роўнымі ў правах, абвяшчалася таксама свабода сумлення і веравызнання. [2, 122] Гэтыя людзі, якія групаваліся ў складзе так званай патрыятычнай партыі, імкнучыся да вызвалення краіны з-пад уплыву Расіі, злучылі з праграмай, якая датычыла знешняй палітыкі, і планы рэформы грамадскага ладу ў адпаведнасці з патрабаваннямі краіны і патрабаваннямі прагрэсу.

План рэформы, аўтарам якой стаў ксёндз Гуга Калантай, быў своеасаблівым «сімвалам веры» для маладых людзей, захопленых ідэямі Французскай рэвалюцыі. Калантай стварыў нешта накшталт публіцыстычнай канцылярыі (кансерватары назвалі яе «кузніцай»), адкуль выйшла серыя надзённых брашур. Брашурная літаратура ахапіла як агульную карціну будучага ўладкавання Рэчы Паспалітай, так і асобныя пытанні (аб спосабах заняцця прастола, аб стане грамадскіх класаў, аб стане рэлігій і іншыя). [3, 448] . Кансалідацыя патрыятычных сіл у сейме дазволіла прыняць 3 мая 1791 года Закон аб урадзе, які у гістарычнай літаратуры прынята называць Канстытуцыяй Рэчы Паспалітай 3 мая. [4, 219] Канстытуцыя распрацоўвалася і прымалася пад выразным уплывам перадавой асветніцкай думкі. Так, ідэя аб тым, што « ўсялякая улада бярэ пачатак ад народа», вынікала з разважанняў Ж.Ж. Русо. Замацаванне ж пастулата аб падзеле ўлады на тры часткі – заканадаўчую (сейм), выканаўчую (кароль і стража законаў) і судовую, з выразнай перавагай першай, сведчыць аб выкарыстанні ідэй Мантэскье. Г. Калантай і І. Патоцкі, як вядома, лічацца афіцыйнымі аўтарамі праекта Канстытуцыі , але можна без перабольшвання казаць, што ўсе члены патрыятычнай партыі прасоўвалі прагрэсіўныя ідэі ў грамадскую свядомасць, рыхтавалі грамадства да іх успрыняцця, фармулявалі пэўныя падыходы.

Свой уклад у развіццё ідэй, якія былі пакладзены ў аснову Канстытуцыі, зрабіў і Юліан Урсын Нямцэвіч сваёй публіцыстычнай дзейнасцю і напісаннем камедыі, пастаўленай у Варшаўскім тэатры «Вяртанне дэпутата», якая высмейвала шляхецкія забабоны. Нямцэвич уключыўся ў палітычную дзейнасць у якасці дэпутата Чатырхгадовага сейма, дзе выступаў су-

праць свавольства магнатаў і ў абарону сялянства. Ён актыўна працаваў таксама ў якасці рэдактара «Нацыянальнай газеты».

Пасля паражэння сіл, якія выступалі ў абарону Канстытуцыі, і другога падзелу Рэчы Паспалітай, многія прадстаўнікі патрыятычнай партыі апынуліся ў эміграцыі, дзе пачалі рыхтаваць паўстанне. Сябра і ад'ютант Касцюшка, Нямцэвіч разам з ім прайшоў усе выпрабаванні: паражэнне, палон, заключэнне ў Петрапаўлаўскай крэпасці ў Пецярбургу і разам з Касцюшкам пакінуў Расію у 1796 годзе, накіраваўшыся ў Злучаныя Штаты Амерыкі.

Знаёмства з аўтарам Дэкларацыі незалежнасці ЗША Томасам Джэферсанам і членства ў філасофскім таварыстве, якое ўзначальваў Джэферсан, сустрэча з генералам Вашынгтонам у яшчэ большай ступені ўмацавалі дэмакратычныя погляды Нямцэвіча, ягоную перакананасць у недапушчальнасці прыгонніцтва і рабаўладальніцтва.

Пасля вяртання на Радзіму ў 1807 годзе Нямцэвіч актыўна займаецца літаратурнай творчасцю. З-пад яго пяра выходзяць «Думы», якія апярэдзілі рамантычныя творы Міцкевіча, »Літоўскія пасланні», у якіх аўтар выкрывае царскі дэспатызм, паказвае агульнасць карысных інтарэсаў рускай і польскай магнатэрыі. У 1816 годзе выходзяць вядомыя «Гістарычныя песні» Нямцэвіча, якія ў царскай Расіі кваліфікаваліся ў якасці «усеагульнага буквара польскага народа». [5, 18-19]

Вялікую цікавасць да творчасці Нямцэвіча мелі А. С. Грыбаедаў, К. Рылееў. Асобныя даследчыкі лічаць, што ідэю «Гора ад ума» Грыбаедаў запазычыў у Нямцэвіча. [5, 20-21] К. Рылееў рабіў спробы перакладу на рускую мову твораў Нямцэвіча.

«Восень жыцця» Нямцэвіча была такой жа актыўнай, як і яго пачатак: удзел у паўстанні 1830-1831 гг., напісанне вядомага Маніфесту аб нізлажэнні ў Польшчы дынастыі Раманавых, зноў вымушаная эміграцыя, на гэты раз у Парыж.

21 мая 1841 года скончылася жыццё чалавека, які, па словах А. Міцкевіча, ішоў уперадзе свайго часу, завяршыў ягоны бег і памёр апошнім». [5, 26]

Дзякуючы грамадскай і літаратурнай дзейнасці Нямцэвіча пашыраліся дэмакратычныя ідэі і патрыятычныя настроі сярод моладзі беларускіх зямель. Ягоная дзейнасць у якасці члена, а з

1827 года старшыні Варшаўскага таварыства сяброў навук, разгорталася у тым жа кантэксце, што і дзейнасць ініцыятыўнай моладзі, якая стварыла таварыства філаматаў ў Віленскім універсітэце (Т. Зан, А. Міцкевіч і іншыя). Гэтых маладых патрыётаў аб'ядноўвала імкненне дзейнасці на карысць Айчыне. Яны збіралі і аналізавалі беларускі літаратурны фальклор,звычаі і абрады. Фальклорныя вобразы, як вядома зрабілі істотны ўплыў на паэтычную творчасць А. Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана.

210 гадоў таму нарадзіўся Адам Міцкевіч (1798-1855), беларуска-польскі паэт, заснавальнік беларускай (літоўскай) школы ў польскамоўнай літаратуры, прадстаўнікі якой пісалі на тэмы гісторыі і жыцця беларускага народа.

Цікавасць да гісторыі беларускага народа, якую рэалізаваў Ю. Нямцэвіч падчас падарожжаў па Беларусі з мэтаю адшукання і апісання «нацыянальных помнікаў», як і дзейнасць іншых гісторыкаў ( Юстына і Тэадора Нарбутаў), дапамагала нацыянальна вызначыць Беларусь праз прызму гісторыі беларускай дзяржаўнасці, садзейнічала фарміраванню ўсведамлення адметнасці беларускага этнасу.

235 гадоў таму нарадіўся Юстын Нарбут (1773-1845), гісторык, удзельнік паўстання 1794 года, даследчык гісторыі Вялікага княства Літоўскага, аўтар кнігі «Нарыс каранёў літоўскага народу», у якой прыведзены звесткі пра мясцовую гісторыю і міфалогію.

І вось ужо ў пачатку XIX стагоддзя прафессары Віленскага універсітэту Міхайла Баброўскі, Ігнат Даніловіч і іншыя ставяць задачу аднаўлення назалежнага ад Польшы Вялікага княства Літоўскага, вяртання дзяржаўнага статусу беларускай мове. [6, 9] А ў польскамоўнай літаратуры з'яўляецца беларуская плынь, прадстаўленая творамі Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, П. Багрыма, У. Сыракомлі.

195 гадоў таму нарадзіўся Паўлюк Багрым (1813-1891 гг.), паэт-дэмакрат.

185 гадоў таму нарадзіўся Уладзімір Сыракомля (Людвік Кандратовіч (1823-1862), паэт-гуманіст, пісьменнік, публіцыст, краязнаўца.

Гэтыя аўтары пакінулі невялікую, але значную беларускамоўную літаратурную спадчыну. Дзякуючы іх нама-

ганням беларускае грамадства ўздымалася ад старабеларускай да новабеларускай літаратуры. І на нашым небасхіле заззяла яскравая зорка В. Дуніна-Марцінкевіча.

200 гадоў таму нарадзіўся Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (1808-1884). Класік беларускай літаратуры, адзін з пачынальнікаў новага беларускага пісьменства, заснавальнік беларускай драматургіі і тэатра. Ён многа зрабіў для станаўлення новай літаратурнай беларускай мовы.

Пісьменнік Михась Клімковіч, які адным з першых з нашых сучаснікаў звярнуў увагу на Дуніна-Марцінкевича, назваў яго « моцным духам змагаром за беларускую нацыянальную культуру, дэмакратам». Дунін-Марцінкевіч меў і імкнуўся рэалізаваць вялікія творчыя і асветніцкія планы: «Жывучы сярод люду, які размаўляе па-беларуску, прасякнуты яго ладам думак, марачы аб долі гэтага братняга племені, анямеўшага ў маленстве ад невуцтва і цемнаты, вырашыў я для заахвочвання яго да асветы ў духу яго звычаяў, паданняў і разумовых здольнасцяў пісаць на яго ўласнай гаворцы». [7] Перакананасць у неабходнасці адраджэння і шырокага выкарыстання беларускай мовы гучыць у наступных вершаваных радках:

*«Ваш суд мне не страшны.*
*Хай злосна скавыча*
*У будцы сабака. Увагі на пса не звярну я.*
*Як раіць пясняр Сыракомля, пішу я*
*Цяпер, як заўсёды, на мове мужычай».*

М. Багдановіч пісаў пра Дуніна-Марцінкевіча : «Шмат пішучы і шмат друкуючы ён абуджаў вакол сваіх твораў развагі і палеміку, нагадваў пра існаванне беларускай мовы і зародкаў беларускай літаратуры, скіроўваў думку пра мажлівасць іх далейшага развіцця». [7]

З'яўленне новай беларускай літаратуры, таксама як і фарміраванне навуковага беларусазнаўства садзеўнічала росту нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, што праяўлялася ва ўсведамленні насельніцтвам беларускіх зямель сваёй адметнасці, успрыняцця факта існавання беларускай народнасці і права гэтай народнасці на свабоднае развіццё ў межах сваёй краіны. Росту нацыянальнай свядомасці срыялі працы такіх навукоўцаў, як Я. Карскі, І. Насовіч, П. Шейн, і іншыя.

220 гадоў таму нарадзіўся Іван Насовіч (1788-1877). Мовазнаўца-лексікограф, фалькларыст, этнограф. Выдаў першы слоўнік беларускай мовы.

Такім чынам паўставала і афармлялася беларуская нацыянальная ідэя, і гэта была ідэя не проста стварэння незалежнай беларускай дзяржавы, а ідэя стварэння дэмакратычнай народнай дзяржавы, у аснову якой пакладзены канстытуцыйны і парламенцкі вопыт Англіі, ЗША , Францыі. Менавіта так трактаваў галоўную задачу, якая стаяла перад беларускім народам К.Каліноўскі, які станоўча ацэньваў Канстытуцыю 1791 года .

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Том 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) / Ю. Бохан, В. Голубеў, У. Емельянчык і інш. – Мн., 2004. – 351 с. : іл.

2. Новая история : учебник для пед. ин-тов : в 2 ч. Ч. 1. 1640-1870 / под ред. А. Л. Нарочницкого. – 2-е изд., доп. – М., 1972. – 710 с. : к.

3. Грабеньский В. История польского народа / В. Грабеньский. – Мн., 2006. – 798 с. : ил. – (Народы Земли).

4. Юхо І. А. Крыніцы беларуска-літоўскага права / І. А. Юхо. – Мн., 1991. – 238 с.

5. Клейн Б. С. Взгляд из прошлого : ист.-док. очерки. – Мн., 1989. – 158, [2] с. : ил.

6. Лытышонак А. Народзіны беларускай нацыянальнай ідэі / Алег Латышонак // Спадчына. – 1992. – № 1. – С. 9-14.

7. Содаль Ул. «Ён называў сябе дударом беларускім», або Нетыповы памешчык Дунін-Марцінкевіч / матырыялы з гутаркі карэспандэнта І. Марачкінай з Ул. Содалем // Народная воля. – 2008. – 8 лют.